УДК 930.1(476)«1921/39»

***Аляксандр Аляксандравіч Савіч***
*канд. гіст. навук, дац., дац. кафедры гісторыі славянскіх народаў*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна*
***Aliaksandr Savich***
*Candidate of Historical Sciences, Associate Professor,*
*Associate Professor of History of Slavic Peoples*
*of the Brest State A. S. Pushkin University*
e-mail: uleks@tut.by

# ІДЭЙНА-ПАЛІТЫЧНЫЯ АСПЕКТЫ ВЫЗНАЧЭННЯ ПЛОШЧЫ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ АЙЧЫННЫМІ ДАСЛЕДЧЫКАМІ 1920–1930-х гг.

*Вызначаны ідэйна-палітычныя фактары пастаноўкі і навуковага асэнсавання пытанняў тэрыторыі і насельніцтва Заходняй Беларусі ў складзе міжваеннай Польшчы ў 1921–1939 гг. На фоне непрызнання беларускага этнічнага характару заходнебеларускага краю польскімі палітыкамі, ігнаравання кіраўніцтвам польскай кампартыі беларускага этнапалітычнага фактара ў камуністычным руху Заходняй Беларусі адлюстраваны ідэйна-палітычныя і навуковыя пазіцыі беларускіх вучоных у дачыненні да асэнсавання паняцця «Заходняя Беларусь» і вызначэння плошчы яе тэрыторыі на працягу 20–30-х гг. XX ст.*

***Ключавыя словы:*** *тэрыторыя Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг., беларускія вучоныя, ідэйна-палітычная барацьба.*

## *Ideological and Political Aspects of Determining the Area of Western Belarus by Domestic Researchers of the 1920s and 1930s*

*The ideological and political factors of the formulation and scientific comprehension of the issues of the territory and population of Western Belarus as a part of interwar Poland in 1921–1939 were determined. Against the background of non-recognition of the Belarusian ethnic character of the Western Belarusian land by Polish politicians, ignoring the leadership of the Polish Communist Party of the Belarusian ethnopolitical factor in the communist movement of Western Belarus reflected the ideological, political and scientific positions of Belarusian scholars. –30s of the XX century.*

***Key words:*** *the territory of Western Belarus in 1921–1939, Belarusian scientists, ideological and political struggle.*

## Уводзіны

Адным з актуальных пытанняў сучаснай гістарыяграфіі гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. з'яўляецца праблема вызначэння плошчы яе тэрыторыі і колькасці насельніцтва. Ад устанаўлення адпаведных паказчыкаў залежыць як шырыня і шматаспектнасць фактаграфічнага напаўнення гісторыі заходнебеларускага краю, так і ўвогуле яго этнічная і дзяржаўная прыналежнасць. Тэрытарыяльна-дэмаграфічныя праблемы гістарыяграфіі гісторыі краю ўздымаліся як беларускімі даследчыкамі (У. М. Міхнюком, І. І. Коўкелем, С. М. Хомічам), так і польскімі – Я. Мілеўскім і П. Эберхардам. Пры гэтым не атрымалі належнай увагі і выклікаюць сёння навуковую цікавасць, маюць практычнае значэнне пытанні ідэйна-палітычнай абумоўленасці звароту айчынных вучоных да тэрытарыяльна-дэмаграфічных аспектаў гісторыі Заходняй Беларусі.

Мэтай даследавання з'яўляецца выяўленне ідэйна-палітычнага дэтэрмінізму навуковых падыходаў беларускіх вучоных 1920–1930-х гг. да вызначэння плошчы Заходняй Беларусі ў складзе міжваеннай Польшчы.

## Вызначэнне плошчы Заходняй Беларусі беларускімі даследчыкамі 1920–1930-х гг. як частка ідэйнай барацьбы за палітычнае дамінаванне ў краі

Праблема вызначэння плошчы тэрыторыі і колькасці насельніцтва Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы паўстала адразу пасля аднаўлення польскай дзяржаўнасці. Польшча, прэтэндуючы на пашырэнне сваёй тэрыторый да межаў былой Рэчы Паспалітай, намагалася рознымі спосабамі дабіцца ўключэння ў свой склад і этнічных беларускіх земель, што ёй удалося дасягнуць і замацаваць дэ-юрэ паводле Рыжскага міру. Аднак беларускасць спрэчных тэры-

торый беларуска-польскага памежжа выклікала падтрымку сярод некаторых прадстаўнікоў еўрапейскай дыпламатыі. У прыватнасці, член міжнароднай кантрольнай камісіі Лігі Нацый палкоўнік Шардзіны лічыў, што Віленшчына – край беларускі, бо ў ёй пераважаючым элементам з’яўляюцца беларусы [1, арк. 106]. Нягледзячы на гэта, нацыянальна-вызваленчая барацьба ў Заходняй Беларусі патрабавала навуковага абгрунтавання беларускага этнічнага характару краю праз асэнсаванне геаграфічных, дэмаграфічных, гісторыка-этнаграфічных, этнаканфесійных аспектаў праблемы, якія неаднастайна прэзентаваны ў айчыннай навуковай літаратуры. Дзеля грунтоўнай пастаноўкі «антыпольскай справы» ўзнікла неабходнасць стварэння навукова-даследчыцкіх цэнтраў у БССР, якія б аналізавалі стан Заходняй Беларусі. Да таго ж разгортванне антыпольскага супраціўлення, у першую чаргу партызанскай барацьбы, турбавала не толькі польскую ўладу, але і польскіх камуністаў, якія лічылі Заходнюю Беларусь неад’емнай часткай Польшчы. У выніку ў Кампартыі Заходняй Беларусі (КПЗБ), якая была часткай Кампартыі Польшчы (КПП), успыхнула вострая фракцыйная барацьба, якая запатрабавала ад кіраўніцтва БССР і Кампартыі бальшавікоў Беларусі (КП(б)Б) падтрымкі прабеларускай «большасці» ў КПЗБ у яе «барацьбе за Заходнюю Беларусь» з польскімі «шавіністамі». Польскія камуністы актыўна садзейнічалі згортванню партызанскага руху ў Заходняй Беларусі, спадзяванні беларускіх камуністаў на ўз’яднанне з БССР збройным чынам не апраўдаліся. У такіх умовах выявілася неабходнасць забеспячэння навуковай падтрымкі адстойвання «беларускасці» Заходняй Беларусі праз стварэнне навуковай структуры па вывучэнні Заходняй Беларусі. Красамоўным прыкладам такога роду дэтэрмінізму з’яўляецца фармулёўка абгрунтавання стварэння ў 1926 г. Камісіі па вывучэнні Заходняй Беларусі пры Інбелкульце, задачай якой павінна была стаць «барацьба за Заходнюю Беларусь» [2, с. 165].

Актуальным з’яўляецца пытане аб паходжанні тэрміна «Заходняя Беларусь», пры асэнсаванні якога маюцца розныя падыходы. Яшчэ ў 1919 г. былы Старшыня Народнага сакрытарыяту БНР Я. Варонка згадаў адпаведнае паняцце: «Заходняя Беларусь не ёсць спэцыяльны тэрмін, якім беларусы карысталіся бы дзеля акрэсьленьняў пэўнай часткі нашай бацькаўшчыны. Назва гэта вырастае цяперка сама сабой з цяжкаго пяцілецьця сучаснай эпохі, асабліва з таго часу, як лінія нямецка-расійскіх акопаў 1917 г. раздзяліла ўсю Беларусь на дзве тэрыторыі, прымусіўшы беларусаў у кожнай з іх тварыць адно і тое палітычнае жыцьцё, але па-свойму» [3, арк. 24]. Агучаная Я. Варонкам ідэя «нямецка-расійскіх акопаў 1917 году» ў высвятленні пачатку ўзнікнення паняцця «Заходняя Беларусь» лагічна вядзе ў 1915 г., адсылаючы нас таксама і да 3 сакавіка 1918 г., калі падпісаны ў г. Брэсце мірны дагавор упершыню стварыў юрыдычныя падставы падзелу Заходняй Беларусі на дзве часткі [4, с. 117].

У сувязі з гэтым неабходна згадаць неадназначную пазіцыю А. Шлюбскага, які ў чарнавым варыянце працы «Этнографический очерк Западной Белоруссии» выказаўся наступным чынам: «Название “Западная Белоруссия” самого недавнего происхождения, оно ведет свое начало с 1923 г. как прямое последствие Рижского мирного договора, по которому часть этнографических и исторических белорусских земель была включена в состав Польской Республики, а северная часть белорусского края вошла в состав Латвийской Республики» [5, арк. 1]. З урыўка становіцца зразумелым, што гэты матэрыял не 1920 г., як памылкова пазначана ў назве архіўнай справы, і не раней 1923 г., калі А. Шлюбскі рыхтаваў чарговы этнаграфічны нарыс, выкарыстаўшы гатовую чарнавую вокладку з тэкстам «Артыкул Шлюбскага аб Заходняй Беларусі. 1920. Рукопись Шлюбского об западной Белоруссии 1920 г.». З гэтага вынікае, што і А. Шлюбскі тэрмін «Заходняя Беларусь» прымяняў ужо ў 1920 г. Як бачым, пры вызначэнні паняцця «Заходняя Беларусь» А. Шлюбскі ў якасці храналагічных маякоў назваў даты 1921 (Рыжскі мір) і 1923 гг., не патлумачыўшы прычыны выдзялення, магчыма і памылкова, апошняй даты. Аднак з высокай ступенню верагоднасці можна сцвярджаць, што А. Шлюбскі свой матэрыял падрыхтаваў па замове кіраўніцтва КП(б), якое ў змаганні з кіраўніцтвам польскай кампартыі адстойвала Заходнюю Беларусь і ў 1923 г. намагалася стварыць «беларускую» КПЗБ на беларускіх этнічных тэрыторыях.

Скептычна ацэньваючы існуючую версію аб узнікненні паняцця «Заходняя Беларусь» у 1923 г. як абшару, на якім, паводле А. Бергман, дзейнічала КПЗБ [6, с. 9], адзначым, што партыя атрымала назву ад тэрыторыі, яшчэ раней названай адпаведным чынам, таму ўслед за І. Коўкелем і У. Міхнюком падкрэслім беспадстаўнасць такога меркавання. Адзначым, што тэрмін «Заходняя Беларусь» згадваецца Б. Тарашкевічам у яго аўтабіяграфіі восенню 1920 г. як магчымая назва дзяржавы на тэрыторыі Сярэдняй Літвы, захопленай Л. Жэлігоўскім [7, с. 132–133], і ў дыпламатычных дакументах ураду БНР [8, с. 975–983, 986–991, 1017–1018]. Праўдападобнасць інфармацыі Б. Тарашкевіча пацвярджаецца і архіўнымі дакументамі, у прыватнасці, звесткамі рукапісу неўстаноўленага аўтара пра падзеі беларускага грамадска-палітычнага жыцця на Віленшчыне напярэдадні акцыі Л. Жэлігоўскага. З крыніцы вядома, што ў створаную польскім бокам сакрэтную камісію былі запрошаны і беларускія дзеячы, «бо палякі хочуць выкарыстаць згоду ўсіх нацыянальнасцей Віленшчыны, бо без гэтага Антанта і нават Францыя супроць прадвіжэння польскіх войск далей лігіі Керзана... Першыя дні камісія шукала назву новай дзяржавы. Былі прапазыцыі назваць “Заходняя Беларусь”» [9, арк. 24–26].

Згаданае даследаванне А. Шлюбскага, хутчэй за ўсё, было падрыхтавана ў адказ на запыт кіраўніцтва КП(б)Б, якое вяло актыўную працу па арганізацыі сваіх камуністычных адзінак у Заходняй Беларусі. Прынцыпова трэба адзначыць тое, што за ўплыў на тэрыторыі Заходняй Беларусі адбывалася вострае суперніцтва паміж КПП і КП(б)Б, якія на месцах праз сваіх агентаў стваралі камуністычныя асяродкі, выкарыстоўваючы камуністычныя сродкі Варшавы ці Мінска, ажыццяўлялі агітацыю сярод мясцовага насельніцтва. Пры гэтым камуністычныя дзеячы з Мінска звярталі ўвагу на неабходнасць агітацыі сярод мясцовага сельскага насельніцтва – беларусаў, у той час як «варшавякі» грэбавалі гэтай справай. Таму, відавочна, стварэнне КПЗБ як складовай часткі КПП трэба разглядваць як перамогу польскіх камуністаў і няўдачу беларускіх. Характэрным бачыцца той факт, што ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь дакументы за 1921–1922 гг., якія ілюстрроўваюць працэс стварэння камуністычнага асяродку ў Брэсце, Беластоку, Вільні, згрупаваны па справах, у назвах якіх маюцца фармулёўкі «Брэсцкая арганізацыя КП(б)Б», «Беластоцкі акруговы камітэт КП(б)Б» [10; 11].

Польскія камуністы ў сваім апанаванні Заходняй Беларусі выкарыстоўвалі рыжскія пагадненні, канструкцыю, у якой дэ-юрэ не было такой адміністратыўнай адзінкі. З ліста прадстаўнікоў т. зв. «сэцэсіі» – нацыянальна арыентаванай беларускай групоўкі ў КПЗБ – у Выканкам Камінтэрна бачым адкрытае нежаданне кіраўніцтва КПП прызнаваць правамоцнасць беларуска арыентаваных этнапалітычных меркаванняў сваіх паплечнікаў з КПЗБ. Крыніца паведамляе, што ў 1921 г. па рашэнні Камінтэрна «Центральная организация Зап. Белоруссии должна была получить “информатора” из ЦК Польши. Осенью этого года мы имели возможность поехать в Варшаву и снестись с ЦК. На совещании был затронут вопрос о наших “крессах”. Бюро ЦК тогда изрекло следующее: “Вы там все твердите в своей литературе о какой-то оккупации. По Рижскому договору Россия уступила Польше Западную Белоруссию. Несколько спорным является вопрос о Виленщине. Мы (Варшава) будем работать теперь во всей З. Беларуси, со включением виленско-дисненского коридора, а вы должны ограничиться Виленщиной. <u>Оккупации никакой нет, а трактат есть трактат</u>”. По мнению тогдашнего ЦК значило, что <u>законная</u> Польша вполне <u>законным</u> образом (по Рижскому Трактату) владела <u>законными</u> крессами – и коммунисты этих самых «кресов» должны были выбросить из своей головы всякую мысль об оккупации и стать чуть ли не лояльными гражданами и подданными Польши, радуясь величию и могуществу своего новообретенного отечества» [12, арк. 4] (падкрэслена ў крыніцы. – *А. С.*).

Таму беларускім камуністам прынцыпова важна было абгрунтаваць этнічны характар тэрыторыі краю і вызначыць яго межы. Гэта было б падставай для утварэння беларускай КПЗБ і вызначэння падкантрольных ёй межаў. Акрамя А. Шлюбскага, у гэты час ажыццяўляў сваё даследаванне вядомы беларускі аўтар, супрацоўнік Камісіі па вывучэнні Заходняй Беларусі, нявызначаная асоба пад псеўданімам Раман Паўстынскі, які ў працы «Статыстыка Заходняй

Беларусі» падаў плошчу Заходняй Беларусі ў 98 815 км² і насельніцтва ў 3 171 тыс. чалавек (колькасць беларусаў, праваслаўных і каталікоў, – 2 371 766 чалавек) [13, арк. 61–75; 14, арк. 6–7].

Праблема беларуска-польска-літоўскага размежавання патрабавала грунтоўнага вывучэння не толькі палітыка-дэмаграфічных, але і прыродна-геаграфічных аспектаў, якія дазвалялі выявіць стан гаспадарча-культурнай сувязі і падпарадкавання беларускіх «крэсаў» Польшчы, што мелі на ўвазе айчынныя даследчыкі А. Смоліч і Г. Гарэцкі. У прыватнасці, А. Смоліч з'яўленне паняцця «Заходняя Беларусь» звязваў з Рыжскім мірам, лічыў, што «пад панаваньнем буржуазных дзяржаў знаходзіцца 117 тыс. км² беларускае зямлі, з якіх пад Польшчай – 110 тыс. км², пад Латвіяй – 7 тыс. км²» [15, с. 6, 7]. Аўтар звярнуў ўвагу на прэтэнзіі «империалистов современной Литовской Республики» на Заходнюю Беларусь ці яе частку, у той час, як «количество литовцев не превышает 2 проц., поднимаясь только в одном уезде (Свенцянском) до 25 проц.» [16, с. 91–92]. Такім чынам, ужо ў пачатку 1920-х гг. асэнсаванне паняцця «Заходняя Беларусь» і вызначэнне межаў яе тэрыторыі закранала не толькі беларуска-польскія, але і беларуска-літоўскія спрэчкі [17].

Праца Г. Гарэцкага «Межы заходняй Беларусі ў Польшчы (Нацыянальны склад насельніцтва заходняй Беларусі)» была выдадзена на беларускай і англійскай мовах і прыцягнула ўвагу навукоўцаў, у тым ліку і з заходніх краін. Вядома, што пасля выхаду публікацыі аўтар атрымаў запрашэнне на чытанне лекцый у Оксфардскім універсітэце [18, с. 149]. З'яўленне гэтага даследавання было абумоўлена высокай ступенню грамадска-палітычнай актуальнасці праблемы вызначэння плошчы тэрыторыі Заходняй Беларусі і яе насельніцтва, таму аўтар імкнуўся забяспечыць высокую аб'ектыўнасць даследавання і атрыманых вынікаў. Гэта было дасягнута ў выніку грунтоўнага крыніцазнаўчага аналізу, выкарыстання вялікай колькасці крыніц, якія меліся на той час, у тым ліку этнаграфічных даследаванняў, галоўным з якіх былі праца Я. Ф. Карскага «Беларусы», матэрыялы Усерасійскага перапісу 1897 г., перапісу 1909 г., зробленага па загадзе Сталыпіна, нямецкія перапісы ў час «імперыялістычнай» вайны 1916, 1917, 1918 гг., перапіс 1919 г., праведзены Цывільным урадам Усходніх зямель Польшчы, «другі» польскі перапіс 1921 г., які ахапіў амаль усю Заходнюю Беларусь, даследаванні Л. Чаркоўскага і А. Закржэўскага. Акрамя гэтага Г. Гарэцкі выкарыстаў матэрыялы абмежаванага характару, якія ўтрымліваюць асобныя дэмаграфічныя паказчыкі, у тым ліку статыстычныя дадзеныя нацыянальнага складу расійскай арміі па паветах 1858 г., статыстыку землеўласнікаў, землеўладання і выбаршчыкаў; школьны перапіс 1911 г., звесткі аб нацыянальным складзе вучняў пачатковых школ за 1920-я гады, статыстыку нацыянальнай прыналежнасці паслоў у Сейм Польшча і статыстыку саміх выбараў (пры гэтым аўтар гаворыць што яе трэба адкінуць, бо яны могуць прывесці да ненавуковых вынікаў), нацыянальную статыстыку ў дзяржаўных установах, якая адлюстроўвае «асіміляцыйную палітыку Польшчы, яе імпэрыялістычна-колёнізацыйны тып», нацыянальную статыстыку рэпатрыянтаў [19, с. 7, 20].

Прынцыповая навуковая пазіцыя Г. Гарэцкага ў дачыненні да вынікаў польскіх перапісаў заключалася ў рашучым адмаўленні іх па беларускіх ваяводствах, у першую чаргу штучнага заніжэння колькасці беларускага насельніцтва, у прыватнасці шляхам залічэння да палякаў беларусаў-каталікоў. Ён канструктыўна і абгрунтавана крытыкаваў навукова-статыстычныя даследаванні польскіх аўтараў, разам з гэтым ухваляючы імкненне да аб'ектыўнасці польскіх аўтараў К. Сракоўскага, Л. Васілеўскага і А. Закржэўскага. Яны, выкрываючы хібы і тэндэцыйнасць польскіх перапісаў, павялічвалі колькасць беларускага насельніцтва ў Польшчы. Сам даследчык усё насельніцтва Заходняй Беларусі ў межах Ашмянскага, Браслаўскага, Віленска-Трокскага, Вілейскага, Дзісенскага, Лідскага, Свянцянскага, Аўгустоўскага, Беластоцкага, Бельскага, Берасцейскага, Ваўкавыскага, Гродненскага, Кобрынскага, Пружанскага, Сакольскага, Слонімскага, Навагрудскага, Пінскага паветаў, часткі Мазырскага, Мінскага, Слуцкага і Барысаўскага паветаў, вызначыў у 3 214,7 тыс. чалавек (гарадское насельніцтва 474,2 тыс. чалавек, вясковае – 2 740,5 тыс. чалавек). З гэтых дадзеных Г. Гарэцкі вылучыў асобна коль-

касць беларусаў і беларусаў-католікоў. Так, па меркаванні аўтара, колькасць беларусаў у Заходняй Беларусі складала 2 329,6 тыс. чалавек (паводле К. Сракоўскага – 1,6 млн), з якіх 941,5 тыс. чалавек з’яўляліся католікамі. У працэнтным суадносенні Г. Гарэцкі давёў колькасць беларусаў у Заходняй Беларусі да 72,5 %, што ў кантэксце арыентаванасці кіраўнікоў Польшчы на паланізацыю набывала красамоўны палітычны сэнс [19, с. 58].

Прынцыпова адзначым, што даследаванне Г. Гарэцкага было выдадзена ў 1928 г. у разгар фракцыйнай барацьбы ў КПЗБ паміж, з аднаго боку, прабеларускай «большасцю» і КП(б)Б, і прапольскай «меншасцю» і КПП, з другога боку. Вастрыня беларуска-польскіх супярэчнасцей у камуністычным руху была настолькі вострай, што прымусіла ўмяшацца ў справу Выканкам Камінтэрна, які прызначыў правядзенне І з’езда КПЗБ у 1928 г. У такой сітуацыі працы беларускіх даследчыкаў па тэрытарыяльна-дэмаграфічнай праблематыцы Заходняй Беларусі мелі вялікае значэнне. Польскія камуністы шырока выкарыстоўвалі свае арганізацыйныя магчымасці, звязаныя з існаваннем польскай секцыі ў Камінтэрне і магчымасцю патрэбнай пастаноўкі адпаведных пытанняў непасрэдна ў Маскве. Як паказваюць крыніцы, кантралюючы сітуацыю ў БССР і Заходняй Беларусі праз Польсекцыю і Прадстаўніцтва КПП пры Выканкаме Камінтэрна, Цэнтральны камітэт па справах палітэмігрантаў пры ЦК МОПРа, польскія функцыянеры неаднойчы мэтанакіравана падвяргалі апале ўдзельнікаў беларускага, у тым ліку камуністычнага руху, якія былі заўважаны ў кантактах з прадстаўнікамі беларускага нацыянальна-вызваленчага руху [20; 21].

Неабходна адзначыць, што паступова пад уплывам прапольска арыентаваных дзеячаў КПЗБ у канцы 1920-х гг. стала назірацца згортванне актуалізацыі дзяржаўна-тэрытарыльнага кампанента айчыннай гістарыяграфіі гісторыі Заходняй Беларусі. Не жадаючы ўзбуджаць недавер польскіх камуністычных дзеячаў і для заспакаення польскай палітыкі і дыпламатыі напярэдадні заключэння польска-савецкага дагавора аб ненападзе 1932 г., беларускія дзеячы пайшлі нават на непрыемны для іх крок: пагадзіліся на ўдакладненне асноўнага нацыянальнага лозунга ў дачыненні да Заходняй Беларусі, пакідаючы ў ім права на самавызначэнне, але без уз’яднання з БССР. На фоне гэтага прыцягвае ўвагу даследаванне С. Будзінскага (вядомага дзеяча КПП, аднаго з арганізатараў у канцы 1920-х гг. у БССР барацьбы з беларускім буржуазным нацыяналізмам. – *А. С.*). Цікавасць гістарыяграфічнай сітуацыі заключаецца ў тым, што вядомы антыбеларускімі справамі С. Будзінскі падаў амаль самую вялікую лічбу тэрыторыі Заходняй Беларусі. Паводле яго, плошча Заходняй Беларусі скаладала 114 206 км$^2$ – 29,5 % ад тэрыторыі Польшчы, а насельніцтва – 4 288 тыс. чалавек – 13,4 % ад усяго насельніцтва Польшчы [22, арк. 6]. Большыя лічбы па плошчы Заходняй Беларусі знаходзім у В. Фрышмана (121,1 тыс. км$^2$) і Я. Шнейдэра (120,9 тыс. км$^2$) [23, с. V; 24, с. 8].

**Заключэнне**

Вызначальнай задачай ідэйна-палітычнай барацьбы за Заходнюю Беларусь было навуковае абгрунтаванне яе беларускай нацыянальна-дзяржаўнай прыналежнасці насуперак жаданням польскіх дзяржаўна-палітычных колаў. Неадназначна ставілася да статуса Заходняй Беларусі як неад’емнай часткі беларускай этнічнай тэрырторыі з безумоўна прызнанай перспектывай самавызначэння і ўз’яднання з БССР і кіраўніцтва кампартыі Польшчы. Сумесна з літоўскімі палітыкамі і паасобна кіраўнікі КПП інспіравалі альтэрнатыўныя варыянты будучыні Заходняй Беларусі як часткі Польшчы, што законна ўвайшла ў яе склад паводле Рыжскага мірнага дагавору.

Такім чынам, у 1920–1930-я гг. дзяржаўна-палітычная абумоўленасць спрыяла актыўнай пастаноўцы вывучэння пытанняў тэрыторыі і колькасці насельніцтва Заходняй Беларусі як падставы для адстойвання інтарэсаў беларускага насельніцтва як у Польшчы, так і ў БССР, дзе беларускія палітыкі, абапіраючыся на навуковыя гісторыка-дэмаграфічныя і геаграфа-статыстычныя даследаванні, маглі абараняць Заходнюю Беларусь ад польскіх захадаў з іх імкненнем замацаваць яе за Польшчай.

СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Нацыянальна архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 325. Воп. 1. Спр. 54.

2. Астрога, В. А. «Шпіёнскае гняздо»: Стварэньне і дзейнасьць Камісіі па вывучэньні Заходняе Беларусі / В. А. Астрога // Спадчына. – 1996. – № 6. – С. 156–167.

3. Варонка, Я. Заходняя Беларусь: Гродзеншчына і Віленшчына. Палітыка-статыстычны нарыс з дадаткам дакументаў і пратэстаў проці польскай акупацыі / Я. Варонка. – Коўна, 1919 // Беларускі Дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва. – Ф. 3. Воп. 1. Спр. 152. – 29 арк.

4. Савіч, А. А. Заканчэнне Першай сусветнай вайны і мілітарызацыя настрояў насельніцтва Заходняй Беларусі / А. А. Савіч // Март 1918 года. На изломе истории… : материалы Междунар. науч.-практ. конф., Брест, 14–15 марта 2018 г. / редкол.: Г. Г. Бысюк [и др.]. – Брест : Альтернатива, 2018. – С. 117–123.

5. Шлюбский, А. Этнографический очерк Западной Белоруссии (1920 г.) / А. Шлюбский // НАРБ. – Ф. 60п. Воп. 3. Спр. 654. – 14 арк.

6. Bergman, A. Sprawy białoruskie w II Rzeczypospolitej / A. Bergman. – Warszawa : PWN, 1984. – 288 s.

7. Валахановіч, А. І. Споведзь у надзеі застацца жывым: аўтабіяграфія Браніслава Тарашкевіча / А. І. Валахановіч, У. М. Міхнюк ; рэд. А. С. Ліс. – Мінск : БелНДІДАД, 1999. – 200 с.

8. Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Т. 1. Кн. 2. Фонд № 582 Дзяржаўнага архіву Літвы («Рада Міністраў Беларускай Народнай Рэспублікі») / Беларус. ін-т навукі і мас-тацтва ; Т-ва беларус. пісьменства ; Наша Ніва / уклад., падрыхт. тэксту, уступ. арт., камент., пер., паказальнікі, кампутарны набор, макет С. Шупа. – Вільня ; Нью Ёрк ; Менск ; Прага. – Printed in Lithuania, 1998. – 1721 с.

9. НАРБ. – Ф. 60п. Воп. 3. Спр. 606.

10. НАРБ. – Ф. 242п. Воп. 2. Спр. 11.

11. НАРБ. – Ф. 242п. Воп. 2. Спр. 12.

12. Российский государственный архив социально-политической истории (РГАСПИ). – Ф. 495. Оп. 129. Д. 71.

13. НАРБ. – Ф. 242п. Воп. 1. Спр. 7.

14. НАРБ. – Ф. 242п. Воп. 2. Спр. 66.

15. Смоліч, А. Кароткі курс геаграфіі Беларусі / А. Смоліч. – Менск : Дзярж. выд-ва Беларусі, 1925. – 352 с.

16. Смолич, А. Географический и топографический очерк Западной Белоруссии / А. Смолич // Западная Белоруссия : сб. ст. – Менск : Белорус. гос. изд-во, 1927. – Кн. 1. – С. 91–125.

17. Савіч, А. А. Праблема дзяржаўнай прыналежнасці Віленшчыны ў ідэалогіі камуністычнага руху Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. (гістарыяграфія праблемы) / А. А. Савіч // Вес. НАН Беларусі. Сер. гуманітар. навук. – 2011. – № 1. – С. 54–59.

18. Острога, В. А. Развитие научных и образовательных центров по Новой и Новейшей истории в Белорусской ССР. 1919–1991 гг. / В. А. Острога. – Минск : Респ. ин-т высш. шк., 2016. – 427 с.

19. Гарэцкі, Г. Межы Заходняй Беларусі ў Польшчы (Нацыянальны склад насельніцтва Заходняй Беларусі) / Г. Гарэцкі // Матар'ялы да геаграфіі і статыстыкі Беларусі. – Менск : Ін-т беларус. культуры. Адзел прыроды і народнай гаспадаркі, 1928. – Т. 1. – С. 1–169.

20. РГАСПИ. – Ф. 495. О. 123. Д. 228.

21. РГАСПИ. – Ф. 495. О. 123. Д. 248.

22. Будинский, М. Очерк экономической географии Западной Белоруссии. 1934 / М. Будинский // НАРБ. – Ф. 60п. Оп. 3. Д. 646. – 17 л.

23. Фришман, В. Промышленность Западной Белоруссии. Стататистико-экономическое описание / В. Фришман. – Минск : Изд-во Беларус. акад. наук, 1934. – 133 с.

24. Шнейдер, Я. Очерк размещения промышленности Западной Белоруссии / Я. Шнейдер. – Минск : Изд-во Акад. наук, 1936. – 104 с.

REFERENCES

1. Nacyjanal'ny arkhiu Respubliki Bielarus' (NARB). – F. 325. Vop. 1. Spr. 54.

2. Astroha, V. A. «Shpijonskaje hniazdo»: Stvaren'ne i dzejnas'c' Kamisii pa vyvuchen'ni Zakhodniae Bielarusi / V. A. Astroha // Spadchyna. – 1996. – № 6. – S. 156–167.

3. Varonka, Ya. Zakhodniaja Bielarus': Hrodzienshchyna i Vilienshchyna. Palityka-statystychny narys z dadatkam dakumientau i pratestau proci pol'skaj akupacyi / Ya. Varonka. – Kouna, 1919 // Bielaruski Dziarzhauny arkhiu-muziej litaratury i mastactva. – F. 3. Vop. 1. Spr. 152. – 29 ark.

4. Savich, A. A. Zakanchennie Piershaj susvietnaj vajny i militaryzacyja nastrojau nasiel'nictva Zakhodniaj Bielarusi / A. A. Savich // Mart 1918 goda. Na izlomie istorii… : matierialy Miezhdunar. nauch.-prakt. konf., Briest, 14–15 marta 2018 g. / riedkol.: G. G. . Bysiuk [i dr.]. – Briest : Al'ternativa, 2018. – S. 117–123.

5. Shliubskij, A. Etnografichieskij ochierk Zapadnoj Bielorussii (1920 g.) // NARB. – F. 60p. Vop. 3. Spr. 654. – 14 ark.

6. Bergman, A. Sprawy białoruskie w II Rzeczypospolitej / A. Bergman. – Warszawa : PWN, 1984. – 288 s.

7. Valakhanovich, A. I. Spoviedz' u nadziei zastacca zhyvym: autabijahrafija Branislava Tarashkevicha / A. I. Valakhanovich, U. M. Mikhniuk ; red. A. S. Lis. – Minsk : BelNDIDAD, 1999. – 200 s.

8. Arkhivy Bielaruskaj Narodnaj Respubliki. T. 1. Kn. 2. Fond № 582 Dziarzhaunaha arkhivu Litvy («Rada Ministrau Bielaruskaj Narodnaj Respubliki») / Bielarus. in-t navuki i mastatstva ; T-va bielarus. pis'mienstva ; Nasha Niva / uklad., padrykht. tekstu, ustup. art., kamuient., peraklady, pakazal'niki, kamputarny nabor, makiet S. Shupa. – Vil'nia ; N'ju York ; Miensk ; Praha : Printed in Lithuania, 1998. – 1721 s.

9. NARB. – F. 60p. Vop. 3. Spr. 606.

10. NARB. – F. 242p. Vop. 2. Spr. 11.

11. NARB. – F. 242p. Vopp. 2. Spr. 12.

12. Rossijskij gosudarstviennyj arkhiv socvial'no-politichieskoj istorii (RGASPI). – F. 495. Op. 129. D. 71.

13. NARB. – F. 242p. Vop. 1. Spr. 7.

14. NARB. – F. 242p. Vop. 2. Spr. 66.

15. Smolich A. Karotki kurs heohrafii Bielarusi / A. Smolich. – Miensk : Dziarzh. vyd-va Bielarusi, 1925. – 352 s.

16. Smolich, A. Geografichieskij i topografichieskij ochierk Zapadnoj Bielorussii / A. Smolich // Zapadnaja Bielorussija : sb. st. – Miensk : Bielorus. gos. izd-vo, 1927. – Kn. 1. – S. 91–125.

17. Savich, A. A. Prabliema dziarzhaunaj prynaliezhnasci Vilienshchyny u idealohii kamunistychnaha rukhu Zakhodniaj Bielarusi 1921–1939 hh. (histaryjahrafija prabliemy) / A. A. Savich // Vies. NAN Bielarusi. Sier. humanitar. navuk. – 2011. – № 1. – S. 54–59.

18. Ostroga, V. A. Razvitije nauchnykh i obrazovatiel'nykh centrov po Novoj i Noviejshej istorii v Bielorusskoj SSR. 1919–1991 gg. / V. A. Ostroga. – Minsk : Resp. in-t vyssh. shk., 2016. – 427 s.

19. Harecki, H. Miezhy Zakhodniaj Bielarusi u Pol'shchy (Nacyjanal'ny sklad nasiel'nictva Zakhodniaj Bielarusi) / H. Harecki // Matar'jaly da heahrafii i statystyki Bielarusi. – Mensk : In-t bielarus. kul'tury. Addziel pryrody i narodnaj haspadarki, 1928. – T. 1. – S. 1–169.

20. RGASPI. – F. 495. O. 123. D. 228.

21. RGASPI. – F. 495. O. 123. D. 248.

22. Budinskij, M. Ochierk ekonomichieskoj gieografii Zapadnoj Bielorussii. 1934 / M. Budinskij // NARB. – F. 60p. Op. 3. D. 646. – 17 l.

23. Frishman, V. Promyshliennost' Zapadnoj Bielorussii. Statistiko-ekonomichieskoje opisanije / V. Frishman. – Minsk : Izd-vo Bielarus. akad. nauk, 1934. – 133 s.

24. Shneider, Ya. Ochierk razmieshchienija promyshliennosti Zapadnoj Bielorussii / Ya. Shnejder. – Minsk : Izd-vo Akad. nauk, 1936. – 104 s.

*Рукапіс паступіў у рэдакцыю 23.09.2021*